# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 24 ВЕРАСНЯ 1992 года №№ 14—15 (1679—1680)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА


НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

## ТЭАТР, КВЗ І СТУДЫЯ ПЛАСТЫКІ

*Хутка месяц, як вы ў роспачы. Пець, танцаваць ці іграць на музычных інструментах не ўмееце, і таму «Неруш» і «Крыжачок», хор і аркестр народных інструментаў — словам, усё, пра што мы распавядалі ў мінулым нумары,— не для вас. Тады...*

**Аматараў сцэны з артыстычнымі здольнасцямі і яскравым пачуццём гумару чакаюць у НАРОДНЫМ СТУДЭНЦКІМ ТЭАТРЫ І КАМАНДЗЕ КВЗ, добра вядомай у горадзе і рэспубліцы сваімі прыгожымі перамогамі. Мастацкі кіраўнік — Андрэй АНДРЭЕЎ.**

**Для тых, хто марыць сыграць на студэнцкай сцэне, ёсць яшчэ адзін шанц — універсітэцкі ЭСТРАДНЫ ТЭАТР пад кіраўніцтвам Людмілы ЕРМАК. Калі ў вас атрымаецца трапіць у лік яго ўдзельнікаў, вы зможаце паспрабаваць свае здольнасці ў творах класічнай драматургіі, у тэатры беларускай песні, а таксама ў эстраднай мініяцюры.**

**Ёсць ва універсітэце і СТУДЫЯ ПЛАСТЫКІ І ПАНТАМІМЫ, арганізаваная ў 1981 годзе. Яна чакае менавіта вас, калі вы апантаны жаданнем выступаць у любым рэжыме, на любой пляцоўцы з класічнай пантамімай ці самымі сучаснымі танцамі (ад брэйка да хіп-хопа) і авалодаць сучаснай інтуітыўнай пластыкай.**

**Калі ў вас не хапае смеласці, каб накіравацца адразу на рэпетыцыю абранага вамі калектыву, звярніцеся ў студэнцкі клуб мастацкай самадзейнасці, які знаходзіцца ў 401 пакоі галоўнага корпуса. Мастацкі кіраўнік клуба Інеса АПАЛАЙКА адкажа на ўсе вашы пытанні, нават на самыя нерашучыя. Дзейнічайце!**



ЦІ Ў ЛАД ЗАГАД?

## Паўтараемся, браткі!

**Сумесны загад Міністэрства абароны і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь абвясціў аб спыненні падрыхтоўкі на ваенных кафедрах ВНУ мотастралкоў і танкістаў. Які ж лёс чакае ў сувязі з гэтай падзеяй мотастралкоў, што рыхтуюцца зараз на ваеннай кафедры нашага універсітэта, і саму кафедру? За адказамі на гэтыя пытанні мы звярнуліся да загадчыка ваеннай кафедры БДУ палкоўніка Ю. І. БАЛЬШАКОВА.**

Юрый Ільіч паведаміў, што кафедра не спыняе свайго існавання з нагоды вышэй названага загаду. Мотастралкі-студэнты 4-га курса скончаць сваю вучобу ў гэтым навучальным годзе, а з наступнага — кафедра будзе рыхтаваць афіцэрскія кадры для артылерыйскіх, хімічных войскаў, а таксама войскаў супрацьпаветранай абароны. Вучыцца на гэтых спецыяльнасцях будуць толькі студэнты прыродазнаўчых факультэтаў. Прычым не ўсе жадаючыя, а толькі тыя, хто будзе адпавядаць пэўным крытэрыям: сярэдні бал паспяховасці ва універсітэце не менш чым 4,5; належная фізічная падрыхтоўка і добрае здароўе, а яшчэ абавязкова — прафесійная прыдатнасць.

Астатнім студэнтам, якія яшчэ не знаёмыя з войскам, давядзецца пасля заканчэння універсітэта прайсці гадавую службу. Але і ў іх застаецца шанц стаць афіцэрамі запасу — у выпадку, калі пасля 12 месяцаў службы ў якасці радавых яны прадоўжаць яе на трохмесячных зборах.

Памятаеце, гадоў дзесяць таму адбывалася нешта падобнае? Але пазней на змену скарачэнням прыйшло расшырэнне ваенных кафедраў вышэйшых навучальных устаноў. Палкоўнік Ю. І. Бальшакоў упэўнены, што праз некаторы час мы зноў станем сведкамі такога ж працэсу.

Пакуль жа праблема ў загадчыка ваеннай кафедры процілеглая — скарачэнне. Часткова вырашыць яе дапамогуць адпаведныя дакументы. Напрыклад, палажэнне аб тым, што ваеннаслужачыя, якія маюць права на пенсію, павінны быць звольнены да 1 снежня 1992 года. У сувязі са скарачэннем Узброенных Сіл Рэспублікі Беларусь могуць быць звольнены таксама ваенныя, якія маюць выслугу ў 20 гадоў. Гэта дае падставу Юрыю Ільічу спадзявацца, што да 1 студзеня будучага года колькасць выкладчыкаў яго кафедры зменшыцца на сем чалавек. Да 1 верасня да іх далучыцца яшчэ дзесяць.

РАТУЙЦЕ!

## ВЫПУСКНІК, ЯКІ САМ ПА САБЕ

***Толькі за апошнія дзесяць дзён у Рэспубліканскі цэнтр занятасці насельніцтва звярнуліся за дапамогай у працаўладкаванні 148 новаспечаных маладых спецыялістаў.***

Па прагнозах спецыялістаў, пік рэгістрацыі беспрацоўных выпускнікоў вучэбных устаноў рэспублікі чакаецца ў канцы верасня. Пакуль жа зарэгістравана 802 чалавекі, 54 працэнты з іх маюць вышэйшую адукацыю.

Дэфіцытны і жаданы калісьці «свабодны» дыплом цяпер не карыстаецца попытам 31930 выпускнікоў універсітэта 654 працаўладкоўваюцца самастойна, 275 наогул не размяркоўваліся. Пабадзяўшыся ў пошуках свайго месца ў жыцці, многія з іх адчуваюць відавочную настальгію па старых добрых часінах і раз-пораз з'яўляюцца ва універсітэцкім аддзеле кадраў з просьбай даразмеркаваць іх.

Але ж паваротнага шляху няма. І суцяшае хіба толькі тое, што выпускнікам суседніх дзяржаў таксама даводзіцца не салодка — амаль палова выпускнікоў расійскіх ВНУ у гэтым годзе не атрымалі работу па спецыяльнасці.

З. МАРАВА.

ДАМОКЛАЎ МЕЧ

## Мы сталі есці менш смятаны

***Ці сенсацыя гэта для вас? А тое, што колькасць мяса і гародніны ў нашым рацыёне таксама паменшылася? Калі не верыце — значыць, не карыстаецеся паслугамі прадпрыемстваў грамадскага харчавання ці проста не маеце дачынення да класу «сярэдні студэнт».***

На звестках, атрыманых у дырэктара сталовай БДУ **Галіны Раманаўны ПЛЮХІНАЙ**, прадпрыемствы, якія ўваходзяць у склад узначальваемага ёю падраздзялення, цяпер атрымліваюць і рэалізуюць у два разы менш малака, чым год таму назад, а смятаны наогул — у тры-чатыры разы. Галіна Раманаўна ўпэўнена, што такія паказчыкі не могуць не адбіцца на стане здароўя студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

А ці заўважылі яны самі пэўныя змены? У красавіку мы паведамлялі вам, што прадпрыемствы грамадскага харчавання, якія абслугоўвалі універсітэт і падпарадкоўваліся розным трэстам сталовых горада Мінска, пасля ліквідацыі трэстаў аб'ядналіся ў адно падраздзяленне — пад назвай «Сталовая Белдзяржуніверсітэта». Цяпер гэта самастойная адзінка, са сваёй штатнай структурай і Статутам. Але, між тым, трэба зрабіць шмат агаворак перш чым назваць яе самастойнай. Раней «гаспадаром» кожнай сталовай быў трэст, якому яна падпарадкоўвалася: ён з'яўляўся фондадаўцай, ён клапаціўся пра выдаткі на транспарт і электраэнергію, яму належылі 2,5 працэнта ад даходаў сталовай за рознага роду адміністрацыйныя паслугі. Трэстаў больш няма. А праблемы засталіся і, больш таго, павялічыліся разам з ростам цэн. Транспартныя, энергетычныя і іншыя паслугі катастрафічна даражэюць. Агульная сума падаткаў, якія павінна выплочваць сталовая БДУ са сваіх даходаў, выглядае амаль пагражальна — яна перавысіла ўжо 30 працэнтаў. «Шэфства» над сталовай цяпер узяло на сябе ўпраўленне грамадскага харчавання Мінгарвыканкома. Але яно не мае паўнамоцтваў на адмену падаткаў, а яго лісты ў Савет Міністраў аб пакрыцці выдаткаў на транспарт і электраэнергію пакуль застаюцца без адказу.

Дырэкцыя сталовай БДУ зноў у чаканні: вынікі работы за верасень павінны паказаць, ці ёсць магчымасць і надалей захоўваць 30-працэнтную нацэнку (замест 50-працэнтнай у многіх іншых сталовых). А нам застаецца гадаць: ці не прыдзецца наогул адмовіцца ад смятаны на нашым стале?

## ОЙ, «ЛЯВОНІХУ» ДЖОН ПАЛЮБІЎ

**на працягу 1991—1992 навучальнага года студэнты Мічыганскага універсітэта мелі магчымасць у межах курса «Музыка сусвету» вывучаць не толькі «Аўстралійскую польку», але і беларускую «Лявоніху». Традыцыйная бытавая і абрадавая музыка, музычныя міграцыі, беларускі рок — вось тэмы лекцый, якія па запрашэнню адміністрацыі універсітэта выкладала канадка беларускага паходжання этнамузыколаг Марыя Паўла Сурвіла.**

**— Я вельмі ўдзячна выпадку, які прадаставіў магчымасць данесці беларускую музыку да новай аўдыторыі, і была прыемна здзіўлена, калі пачула гукі «Лявоніхі» на перапынку ў карыдоры. Энтузіязм студэнтаў у спасціжэнні музычнай культуры сведчыць, што студэнты не пасіўныя слухачы і сунazіральнікі.**

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

## ТОЛЬКІ ПА ПАДПІСЦЫ

Працягваецца падпіска на першую палавіну 1993 года. Яна праходзіць пасля падаражання амаль усёй прэсы, што выклікана значным павышэннем цэн на паперу (у 80—100 разоў), друкарскія работы, паслугі прадпрыемстваў сувязі.

Часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта» ў параўнанні з іншымі рэспубліканскімі выданнямі прапануе найбольш выгадныя ўмовы падпіскі. Кошт на паўгадавую падпіску часопіса па серыях такі: с. 1 — фізіка, матэматыка, механіка (інд. 74851) — 16 руб.; с. II — хімія, біялогія, геалогія, геаграфія (інд. 74852) — 16 руб.; с. III — гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (інд. 74853) — 8 руб.; с IV — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (інд. 74854) — 8 руб.

Зазначым, што нават пры ўстаноўленай цане страты ад выдання часопіса будуць вялікімі. Натуральна, мы не мяркуем перакладваць усе выдаткі на плечы падпісчыкаў. У той жа час рэдакцыя не адмовіцца ад фінансавай падтрымкі з боку дабрачынцаў выдання.

Вядома, што лепшая рэклама часопісу — яго змест. Але многае залежыць і ад таго, як прапагандуецца і папулярызуецца выданне. Вось чаму ў час правядзення падпіскі мы разлічваем на дапамогу і падтрымку ў справе папулярызацыі «Весніка БДУ» кіраўніцтва беларускіх ВНУ, супрацоўнікаў навукова-даследчых устаноў — усіх, хто неабыякавы да будучыні беларускай навукі, каго турбуе адраджэнне нацыянальнай свядомасці, роднай мовы і культуры.

Падпіска на «Веснік БДУ» прымаецца ў аддзяленнях сувязі Беларусі і СНД.

Часопіс у розніцы продаж не паступае.

РЭДАКЦЫЯ І РЭДКАЛЕГІЯ ЧАСОПІСА.

ШТО НОВАГА?

## «Нашы» людзі ў музеях

***Мы ведаем, дзе размешчаны шыкоўныя крамы, маленькія «камкоўскія» кіёскі, танныя і дарагія кропкі харчавання. Мы сочым за цэнамі на хлеб, малако і сумуем ад таго, што няма абутку на зіму. А ці ўзнікала ў вас калі-небудзь жаданне наведаць музей? Проста так. Здаецца, менавіта зараз для нас гэта не самае неабходнае.***

***І раптам у час рыначнай абыякавасці да духоўных вышынь і вытокаў на гістарычным факультэце адкрываецца новае аддзяленне, на якім будуць рыхтаваць гісторыкаў-архівазнаўцаў і гісторыкаў-музеязнаўцаў. Мы сустрэліся з загадчыкам кафедры крыніцазнаўства і музеялогіі, прафесарам Уладзімірам Нічыпаравічам СІДАРЦОВЫМ.***

**— Як вы ўяўляеце сабе будучыню маладых людзей з такой, скажам, некамерцыйнай, вузка спецыфічнай спецыяльнасцю?**

— Раней, нагадаю, спецыялістаў па архівазнаўству і музеязнаўству рыхтаваў адзіны ў былым Саюзе гісторыка-архіўны інстытут у Маскве. У гэтым годзе мы набралі на стацыянар 25 чалавек, на завочнае аддзяленне — 43. Атрымалася так, што ўсё ж большасць з іх — жыхары Мінска і іншых вялікіх гарадоў Беларусі. Але гэта, хутчэй за ўсё, ад недахопу інфармацыі. І перад тым, як адкрыць такое аддзяленне ў нас, зразумела, былі праве

*(Працяг на 2-ой стар.).*

## УВАХОД НЕ ЗАБАРОНЕНЫ

МАРОЖАНАЕ — ТАКСАМА СІМВАЛ ЖЫЦЦЯ.

# САЛОДКАЕ ЛЮСТЭРКА ЖЫЦЦЯ

Хто не марыў у дзяцінстве папрацаваць на «салодкай» вытворчасці, хаця б дзянёк-другі! Здаецца, жыццё павінна быць саладзейшым для тых, хто выпускае прадукцыю са значнай колькасцю цукру. Але вы развітаецеся з гэтымі дзіцячымі ілюзіямі, калі вам пашчасціць трапіць на Мінскі холадакамбінат № 2.

Калі вы з разраду ласуноў, вас, напэўна, абразіць выгляд гэтага прадпрыемства. Хацелася ж убачыць нешта прывабнае і незвычайнае, як святочны дэсерт, а тут — будынак як будынак, нічога салодкага ў яго выглядзе няма. Наперадзе ў вас яшчэ адно расчараванне: спачатку ў гэтым корпусе было пяць паверхаў, а не чатыры, як зараз, і на пятым выраблялі торты з марожанага. Выраблялі нядоўга — Аэрафлот загадаў разбурыць пяты наверх, бо ён, быццам бы, перашкаджаў самалётам. Ну вось, вы думалі, марожанае ўпрыгожвае жыццё, а яно, як высветлілася, можа нават палётам перашкаджаць...

Спякотнае было сёлета лета. Здаецца, людзі толькі і рабілі, што елі марожанае і пілі ваду. Але гэта зусім не значыць, што марожанага спажывалася як ніколі многа. У пачатку жніўня на складах холадакамбіната захоўвалася... 312 тон (!) таго, аб чым вы так марылі не аднойчы, калі далучаліся да даўжэзнай чаргі. Больш таго, летам фабрыка вырабляла толькі 12—15 тон сваёй прадукцыі ў змену, хаця праектам прадугледжана 20. Норму скарацілі, даўжыню змены таксама, думалі нават пра скарачэнне штатаў — бо гандаль заказваў мізэрную колькасць марожанага пасля яго апошняга падаражання. І гэта ў той час, калі ў горадзе марожанага яўна не хапала, калі, нягледзячы на папулярнасць «Пінгвіна», усё большым поспехам карысталіся даўно знаёмыя стаканчыкі. Знаёмыя і незнаёмыя адначасова: у старой формы з'явіўся новы змест — белае марожанае ператварылася ў жоўтае, зялёнае, аранжавае. Здарылася гэта з дапамогай амерыканскіх араматызатараў-фарбавальнікаў — ананасавага, фісташкавага і апельсінавага адпаведна. Усяго іх было прапанавана холадакамбінату пятнаццаць, але для эксперыменту было выбрана толькі тры. Вы згодны, што ўдалы атрымаўся эксперымент? І пры гэтым — 300 тон на складзе...



Нават калі вам не вельмі да спадобы новае марожанае, вам варта пачаставацца ім непасрэдна на фабрыцы, у дэгустацыйнай зале. Паспрабуйце марожанае, калі яно ўжо прыгатавана, але не прайшло загартоўку і не разліта ў стаканчыкі,— такое мяккае, прыемнае, чароўнае... Сапраўднае марожанае ў яго чыстым выглядзе! Вы маглі б паспрабаваць яго не толькі на холадакамбінаце, калі б наш гандаль не быў такім жа правобразам адышоўшага жыцця, як гэтыя звыклыя да абрыдласці стаканчыкі. Навошта разліваць марожанае абавязкова ў іх, калі можна надаць яму зусім іншы выгляд, а значыць — і густ? Па сваёй пажыўнай каштоўнасці знакаміты «Пінгвін» бясспрэчна прайграе роднаму пламбіру: гэта проста канцэнтрат (імпартны ж!), разведзены вадой, і няма ў ім ні вяршкоў, ні смятанкавага масла, ні сгушчанага малака. Затое ёсць прывабны знешні выгляд. Такі прывабны, што нават апошняя цана — 15 рублёў — мала каго спыняе. А гэта, між тым, амаль у два разы даражэй за пламбір. Каб прапанавалі яго нам хаця б у такі ж конусах ці ў спалучэнні са смачнымі аздабленнямі ў якім-небудзь утульным павільёнчыку (які можна было б сустрэць на кожным кроку) — «Пінгвін» мог бы і абанкроціцца. Але пакуль усё гэта — толькі фантазія...

Халоднае марожанае з'яўляецца на свет спачатку пры вельмі высокіх тэмпературах. Вялізныя машыны, якія нечым нагадваюць заводскія станкі, перамешваюць яго кампаненты і перадаюць сумесь на наступную лінію. Калі глядзіш на гэтую мешаніну вачыма назіральніка з вуліцы... марожанага не хочацца! Але варта ўвайсці ў цэх, дзе гатовыя порцыі «апранаюцца» ў паперу і кардон,— і дзіцячыя жаданні вяртаюцца. І зноў цяжка паверыць, што можна быць няшчасным сярод такой велізарнай колькасці ласункаў. Між тым, жанчыны, якія тут працуюць, жывуць звычайнымі праблемамі. А марожанае яны не ядуць, нават глядзець на яго не хочуць. Так што вы не зайздросце ім. Лепш радуйцеся таму, што можаце частавацца марожаным кожны дзень, што для вас яно — уцеха, і вам можна не думаць пра тое, чаму ласункі таксама бываюць адлюстраваннем нашага складанага жыцця.

**Вераніка БЯГУН.**

## ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

# БУДЗЕМ ЖЫЦЬ ПА-«СЯРЭДНЕЕЎРАПЕЙСКУ»?

**ТАКІМ ЧЫНАМ, НАДРУКАВАНЫ ПРАЕКТ АСНОЎНАГА ЗАКОНУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.**

**ЯГО ДАЎНО ЧАКАЛІ. АБ ІМ ЯШЧЭ ЗАГАДЗЯ НЯМАЛА ГАВАРЫЛІ. І Ў ПЭЎНАЙ МЕРЫ НАДЗЕІ ЗБЫЛІСЯ, БО БЕЛАРУСЬ САПРАЎДЫ ЎПЕРШЫНЮ ПРАДСТАЎЛЕНА ЯК УНІТАРНАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА.**

Праект змяшчае асноўныя канстытуцыйныя нормы, закладзеныя ў канстытуцыйнае права заходнееўрапейскіх краін, і шэраг пазіцый, накіраваных супраць нашага нядаўняга таталітарнага мінулага. Абвяшчаецца, напрыклад, што «ідэалогія ніякай палітычнай партыі, рэлігійнага ці іншага грамадскага аб'яднання, сацыяльнай групы не можа быць устаноўлена ў якасці абавязковай для грамадзян Рэспублікі» (арт. 4); што «суддзі выконваюць свае абавязкі бестэрмінова» (арт. 119). Некаторыя палажэнні дыстанцыруюць праект у яго сённяшнім выглядзе ад непамернага «абажання» народа. Скажам, прэзідэнт рэспублікі «мае права не падпісаць закон, які патрабуе дадатковых выдаткаў, не прадугледжаных бюджэтам. Паўторнае прадастаўленне прэзідэнту такога закону Соймам (парламентам) не дапускаецца» (арт. 102). (Асабіста мне здаецца, што гэтае палажэнне найўрад ці ўвойдзе ў канчатковы тэкст Канстытуцыі, бо папулізм часцяком выступае заменнікам іншых якасцей, неабходных парламентарыям).

Але ёсць у праекце Канстытуцыі многія моманты, якія выклікаюць здзіўленне. Перш за ўсё, на мой погляд, гэта пераацэнка дзяржаўнага і недаацэнка асабістага пачатку ў жыцці грамадства, якая захавалася ад канстытуцыйнага мінулага. Праект «прызнае чалавека вышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы» (арт. 2). Гучыць прыгожа, але аб правільнасці нават гэтага агульнага тэзіса можна спрачацца, бо хіба не чалавек стварае дзяржаву як асаблівую каштоўнасць для задавальнення сваіх спецыфічных патрэб і хіба не з'яўляецца чалавек вышэйшай каштоўнасцю па-за залежнасцю ад наяўнасці грамадства і дзяржавы?

Прычым пры больш старанным аналізе вышэй адзначаная тэндэнцыя праступае яшчэ больш выразна. Артыкул 5 абвяшчае, што «палітычныя партыі і іншыя аб'яднанні грамадзян маюць права карыстацца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі ў аб'ёме і парадку, які ўстаноўлены законам». Атрымліваецца, асобнаму чалавеку такое канстытуцыйнае права не прадастаўлена? Артыкул 70 гаворыць: «Права вылучэння кандыдатаў належыць грамадскім аб'яднанням і групам грамадзян у адпаведнасці з выбарчым законам». Значыць, калі дастойны і кваліфікаваны містэр ікс у поўнай адпаведнасці з выбарчым законам захоча вылучыць сябе кандыдатам для выбрання ў мясцовую ці рэспубліканскую легіслатуру, то Канстытуцыя такога права яму не гарантуе. Артыкул 31, дзе гаворыцца пра тое, што грамадзяне маюць права свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах рэспублікі, пакідаць яе і бесперашкодна вяртацца назад, змяшчае палажэнне, якое сцвярджае, што «абмежаванні гэтых правоў могуць устанаўлівацца толькі законам».

Тады ў чым жа розніца паміж сённяшнім паўпрыгонным станам, дзе законамі аб прапісцы і аб прыбыцці і выездзе гэтае права ператворана ў фікцыю, і палажэннем, якое дэкларуе «свабоднае перамяшчэнне» ў новым праекце?

Хачу задаць нерытарычнае пытанне: што вышэй — закон ці Канстытуцыя? Прачытаўшы праект новай Канстытуцыі Беларусі, адказаць на яго аказваецца вельмі проста: амаль любы закон, прыняты парламенцкай большасцю, будзе абмяжоўваць, карэкціркаваць Канстытуцыю, г. зн. будзе вышэй яе.

У тэксце праекта змешчана велізарная колькасць агаворак аб тым, што тыя ці іншыя канстытуцыйныя правы грамадзян, тыя ці іншыя асновы канстытуцыйнага ладу «вызначаюцца» (устанаўліваюцца») «у адпаведнасці з законам». Зразумела, што наогул без такіх агаворак не абысціся. Напрыклад, арт. 35 устанаўлівае, што «абмежаванні ў ажыццяўленні права на атрыманне інфармацыі па матывах дзяржаўнай, службовай і камерцыйнай таямніц вызначаецца законам».

Але ж большасць агаворак (іх больш за 30) праекта наогул не «матываваны». Гэта значыць, прыйдзе, дапусцім, на выбарах да ўлады партыя камуністаў — мы будзем мець адразу іншую Канстытуцыю, фармальна яе не змяняючы. Заменi іх ля ўлады БНФ — зноў будуць новыя законы... Але ж асноўная функцыя Канстытуцыі — быць гарантам стабільнасці інстытутаў і працэдур грамадзянскага грамадства па-за залежнасцю ад змены правячых эліт. І складваецца ўражанне, што аўтары праекта імкнуліся засцерагчы дзяржаўны лад ад інтрыгаў розных злодзеяў. Роля Канстытуцыі зусім іншая. Яна прызвана абараняць грамадзян ад прыняцця няправільных законаў (таму, між іншым, і называецца Асноўны Закон). Цяпер жа атрымліваецца, што Канстытуцыя спасылаецца на законы (многія з якіх наогул не існуюць), а павінна быць наадварот.

Усе гэтыя бясконцыя спасылкі на «закон» і ліквідуюць фактычна многія з абвешчаных Канстытуцыяй правоў чалавека. Беларусь падпісала Усеагульную Дэкларацыю правоў чалавека ААН, дык давайце перанясем гэтыя правы, якія мы і так абавязаны паважаць, у тэкст нашай Канстытуцыі і адзначым, што ніякія законы не маюць права іх абмяжоўваць, за выключэннем закона аб надзвычайным становішчы.

У праекце таксама многа патэрналісцкіх палажэнняў ураўнавальнага характару, такіх, напрыклад, як «дзяржава гарантуе роўную абарону і роўныя ўмовы для развіцця ўсіх формаў уласнасці» (хаця кожнаму зразумела, што дробная ўласнасць мае патрэбу ў большай абароне і больш спрыяльных умовах, інакш яна загіне); «дзяржава стварае ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва» (арт. 42) (цікава, як будуць сабе ўяўляць «поўную занятасць» нашы будучыя дзяржаўныя кіраўнікі, як прынята ў ЗША, Кітаі ці на Кубе?»; «дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі...» Усе гэтыя прэрагатывы дзяржавы вянчае арт. 26, згодна з якім «дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы». Так што асобе і клапаціцца пра гэтыя каштоўнасці не трэба. І наогул, калі дзяржава бярэцца гарантаваць вельмі многае — успомнім брэжнеўскую Канстытуцыю СССР 1977 года: і права на бясплатную ахову здароўя, і на адукацыю, і на працу, і на жыллё, і на асацыяцыю і г. д. — то на практыцы яна не гарантуе нічога. Час ад часу дзяржаўныя ўладары будуць рабіць выгляд, што выконваюць Канстытуцыю, будуць прымаць праграмы, накшталт харчовай, энергетычнай, жыллёвай, але ўладары пойдуць у адстаўку ці небыццё, а масы, як і раней, застануцца ля разбітага карыта. І не заўсёды гэта здараецца таму, што ўладары дрэнныя. Проста дзяржава не ў стане, як маць, якая корміць, забяспечваць усе жыццёвыя патрэбы ўсіх грамадзян.

На мой погляд, адсутнасць яснага разумення іерархіі нацыянальных інтарэсаў Беларусі дэманструе раздзел VI «Абарона і нацыянальная бяспека». У ім нацыянальная бяспека выводзіцца з абароны, а апошняя — з наяўнасці Узброеных Сіл Рэспублікі. Сусветны вопыт сведчыць, што нацыянальныя інтарэсы краіны эфектыўна абаронены ў доўгатэрміновым плане ў тым выпадку, калі абарона з'яўляецца толькі часткай агульнай стратэгіі нацыянальнай бяспекі, а наяўнасць узброеных сіл толькі часткай абарончай стратэгіі. Дадзены раздзел праекта выклікае яшчэ шмат сур'ёзных пытанняў. Напрыклад, чаму камандаванне Узброенымі Сіламі Рэспублікі ажыццяўляе прызначаны чыноўнік — міністр абароны, а не ўсенародна выбіраемы прэзідэнт? Чаму ваенную дактрыну, структуру і нават арганізацыю Узброеных Сіл вызначае Сойм, у якім, згодна з арт. 142 таго ж раздзела, не можа быць прафесійных вайскоўцаў?

Яўна нявызначаным выглядае раздзел V аб мясцовым самакіраванні. Магчыма, маюць рацыю дэпутаты Пінскага гарадскога Савета, якія выказалі сваю думку наконт праекта ў «Народнай газеце» ад 3 верасня 1992 года.

**МОЖНА ЗАДАВАЦЬ ЯШЧЭ НЯМАЛА ПЫТАННЯЎ ПА КАНКРЭТНЫХ ФАРМУЛЁЎКАХ НОВАГА ПРАЕКТА. У ЦЭЛЫМ ЖА ЁН АДПАВЯДАЕ СУЧАСНЫМ СЯРЭДНЕЕЎРАПЕЙСКІМ СТАНДАРТАМ (ПРАЎДА, З МОЦНАЙ ПРАСАЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ТЭНДЭНЦЫЯЙ). МЯРКУЮ, КАЛІ БУДУЦЬ СКАСАВАНЫ НЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ З АДЗНАЧАНЫХ НЕДАХОПАЎ, Я ПРАГАЛАСУЮ «ЗА» ГЭТУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ НА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ РЭФЕРЭНДУМЕ.**

**А. БАЙЧАРОЎ,**
прафесар, загадчык кафедры паліталогіі.
(«Знамя юности»).

